

# Emmaus

Бюлетэнь *рымска-каталіцкай парафіі Маці Божай Бялыніцкай г. Горкі*
№ 1-2014, 09.02.2014
PDF–архіў на сайце **www.kasciol.by**

## Парафіяльныя абвесткі:



**V Нядзеля Звычайнага Перыяду**.

У літургіі:

- ✓ 10 лютага – успамін св. Схаластыкі, панны;
- ✓ 11 лютага - успамін НПМ з Люрда (Міжнародны дзень хворых).
- ✓ 14 лютага – свята свв. Кірыла і Мяфодзія, апекуноў Еўропы

На гэтым тыдні **расклад святых Імшаў** будзе наступны (спадзяемся, што ўжо ў наступным тыдні будзе інакш):

- ✓ з панядзелку па суботу ўключна – святой Імшы ў капліцы не будзе.
- ✓ у наступную нядзелю – у 10.00 і 16.00.

У нашай парафіі па нядзелях адбываюцца **катэхезы дарослых**, падчас якіх мы спрабуем разам разважаць над нашай духоўнасцю. Сёння паспрабуем разважыць пытанне: “Належны ўдзел у Эўхарыстыі”, а ў наступную нядзелю – “Уступныя абрады”.

Спрабуем арганізаваць ў нашай парафіі невялікую газетку – **штотыднёвы бюлетэнь** для супольнасці, у якім знойдзем м.інш. парафіяльныя абвесткі, разважанне над Божым Словам, і іншую карысную інфармацыю для духоўнасці. Вялікая просьба браць гэтыя лісткі дадому, каб таксама дзяліцца з роднымі і блізкімі. Хто хоча матэрыяльна дапамагчы гэтую справу – звяртацца да Настассі (будзе падрыхтаваны асобны канверт для ахвяраванняў).

**Просьба аб малітве** за тыя парафіі, якія не застаюцца абыякавымі адносна лёсу нашай супольнасці – Ракаўская парафія, парафія св. Сымона і Алены ў Мінску, а таксама парафія св. Яна Евангеліста і св. Максіміліяна ў Мінску. Вельмі шчыра дзякуем асабліва а. Аляксандру Уласу і яго вернікам.

тэл: **8-029-880-99-19** (*кс. Андрэй*)

## Катэхізіс у пытаннях і адказах:



**1. Хто такі Бог?**

- Пан Бог - дасканалы Дух, Стварыцель неба і зямлі, а таксама наш найлепшы Айцец. Бог ёсць адзін у трох Асобах: Бог Айцец, Сын Божы і Дух Святы.

**2. Чаму Пана Бога мы называем Духам?**

- Бога мы называем Духам, бо Ён не мае цела.

**3. Як мы называем Бога ў трох Асобах?**

- Бога ў трох Асобах мы называем Найсвяцейшай Тройцай.

**4. Чаму Пана Бога мы называем вечным?**

- Бога мы называем вечным, бо Ён заўсёды быў, ёсць і будзе.

**5. Дзе ёсць Бог?**

- Бог ёсць на небе, на зямлі і на кожным месцы.

**6. Чаму Пана Бога мы называем Усёбачным?**

- Бога мы называем Усёбачным, бо Ён усё бачыць і ўсё ведае, нават нашыя думкі і жаданні.

**7. Чаму Пана Бога мы называем Стварыцелем?**

- Бога мы называем Стварыцелем, бо Ён стварыў усё з нічога.

8. **Чаму Пана Бога мы называем найлепшым Айцом?**

- Бога мы называем нашым найлепшым Айцом, бо Ён любіць усіх людзей як сваіх дзяцей і клапоціцца аб кожным сваім стварэнні.

**9. Чаму Пана Бога мы называем справядлівым?**

- Бога мы называем справядлівым, бо Ён за добрае ўзнагароджвае, а за злое карае.

**10. Чаму Пана Бога мы называем міласэрным?**

- Бога мы называем міласэрным, бо Ён ахвотна прабачае нам нашыя грахі, калі мы раскайваемся ў іх.

Крыніца: http://katecheta-by.narod.ru/index/0-2.

## Хрысціянскі гумар:



Хлопчык, стаўшы уладальнікам бліскучай новенькай манеткі, вырашыў патраціць яе на марозіва.
- А чаму б табе не ахвяраваць яе царкве? - Спытаў яго святар.
- Я думаў пра гэта, святы айцец, але прыйшоў да высновы, што мне лепш купіць марозіва, а гэтую манетку хай лепш ахвяруе вам лавачнік. (Паводле: www.katolik-gomel.by)

## Падзеі з жыцця Касцёла:



**03.02.2014** - Адбылася сустрэча кансэкраваных асобаў Магілёўшчыны

**04.02.2014** - з нагоды Дня кансэкраванага жыцця, які адзначаецца штогод у свята Ахвяравання Пана, у мінскай парафіі Св. Яна Хрысціцеля праходзіла сустрэча кансэкраваных асобаў Мінска-Магілёўскай архідыяцэзіі.

**04.02.2014** - Святы Айцец Францішак скіраваў сваё першае пасланне на Вялікі пост. Яно атрымала эпіграф з Другога Паслання да Карынцянаў: “Езус стаў бедным дзеля вас, каб вы ўзбагаціліся Ягоным убоствам”.

**05.02.2014** - Адміністратыўнай адзінкай капуцынаў у Беларусі стала «Беларуская Кустодыя Ордэна Меншых Братоў Капуцынаў»

## Нядзельнае Евангелле:

Мц 5, 13–16
*Вы — святло свету*



**У той час Езус сказаў сваім вучням: Вы – соль зямлі. Калі ж соль страціць смак, то чым пасоліш яе? Яна ўжо ні на што не прыдасца, хіба што выкінуць яе вон на патаптанне людзям.**

**Вы – святло свету. Не можа схавацца горад, які стаіць на вяршыні гары. І, запаліўшы свяцільнік, не ставяць яго пад пасудзінаю, але на свечніку, і свеціць усім, хто ў доме.**

**Няхай святло вашае так свеціць перад людзьмі, каб яны бачылі вашыя добрыя ўчынкі і праслаўлялі Айца вашага, які ў нябёсах.**

*Хрыстос заклікае нас, каб мы сведчылі сваім жыццём аб Добрай Навіне. Каб кожны чалавек, які сустрэнецца з намі, хрысціянінамі XXI стагоддзя, мог сказаць: Паглядзіце, як яны сумленна жывуць, працуюць, змагаюцца са штодзённымі цяжкасцямі і праблемамі.*

# Як апранацца, ідучы ў касцёл?



“А ў чым справа??? Няўжо так нельга???” Колькі разоў з гэтымі пытаннямі сутыкаюцца душпастары, калі спрабуюць зрабіць заўвагу наконт таго, як трэба апранацца, збіраючыся прыйсці ў храм Божы. Мы спрабуем тлумачыцца розным: не навучылі, не ведаем і г.д. У той жа час, “няведанне закону не вызваляе ад адказнасці”. Кажам, што не маем “зялёнага паняцця аб тым, як апрануцца, ідучы ў касцёл”, а адначасова лічымся з неабходнасцю адпаведна апрануцца ў іншых месцах і сітуацыях.

Шукаючы адказу на пытанне, як апрануцца ў касцёл, я перш за ўсё павінен адказаць на вельмі простае, але ў той жа час фундаментальнае пытанне: “Куды, навошта і да Каго я іду, выбіраючыся ў касцёл”. Бо праз адзенне выражаецца маё стаўленне да месца і падзеі, на якой я знаходжуся. Цікава, што, напрыклад, у Італіі перад храмамі стаіць “касцёльная варта”, якая прыпамінае аб прыстойным адзенні тых, хто прыходзіць да святых месцаў. Справа датычыць не толькі жанчын, хоць іх у першую чаргу, і не заканчваецца з заканчэннем лета, хоць менавіта ў гэты перыяд узнікае найбольш непаразуменняў.

Праблема выбару годнага, адпаведнага адзення “ў касцёл” – гэта не проста асабістая справа паасобных людзей. Яна, як і ўсе адносіны, патрабуе выхавання з самага ранняга ўзросту. Самае простае правіла пры выбары адзення – зразумець, што наведванне Божага храма варта разглядаць як і любы афіцыйны візіт, падчас якога адбываецца сустрэча з самай важнай асобай. Я прыходжу ў храм, каб памаліцца, і маю абавязак дазволіць гэта зрабіць усім прысутным. Калі ж ёсць нават патэнцыяльная небяспека таго, што я сваім выглядам адстрашу іншых ад Бога, трэба задумацца, ці варта мець гэта на сумленні....

Як у Божым храме, так і ў храме душы чалавека жыве сам Бог: “Ці ж не ведаеце, што вы – храм Божы, і Дух Божы жыве ў вас?” (1 Кар 3, 16)
Крыніца: www.ministrant.by

2014 © **Рымска-каталіцкая парафія Маці Божай Бялыніцкай г. Горкі**